**КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**Лістапад–снежань**

*Інфармацыйнае паведамленне*


Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай



Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by



**ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»**

**Аддзел бібліятэказнаўства**


# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Інфармацыйнае паведамленне*



ЛІСТААД–СНЕЖАНЬ


Віцебск **2014**

конкурсе тэатральнага мастацтва “Нацыянальная тэатральная прэмія”.

*http://news.tut.by/culture/425889.html*

З **18** па **23 лістапада** ў Беларускім тэатры “Лялька” прайшоў тыдзень спектакляў з удзелам вядучага майстра сцэны актрысы *Ларысы Мартынавай*.

**5 снежня** ў Беларускім тэатры “Лялька” адбыўся прэм’ерны паказ спектакля для дарослых “Спакуса”, створанага па п’есе А.П. Чэхава “Чорны манах” у пастаноўцы *В. Клімчука*.

*http://lialka.by/bel/*

“CREDO” сярэдняй школы № 159 г. Мінска (кіраўнік *Т. Сільчанка*). Гран-пры фестывалю дастаўся Маладзёжнаму хору “Brevis” Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў (кіраўнік *С. Кунцэвіч*).

*Телеком-экспресс. – 2014. – 18 дек. – С. 29.*

Напярэдадні Новага года 50-гадовы юбілей адзначыла Бешанковіцкая дзіцячая школа мастацтваў.

*Витебские вести. – 2014. – 27. – С. 22.*

*ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ*

**1 лістапада** ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа адбыўся творчы вечар “Пачну я новы маналог” заслужанага дзеяча мастацтваў, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прэміі “За духоўнае адраджэнне” і Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, акадэміка Міжнароднай Кірыла-Мяфодзьеўскай акадэміі славянскай асветы, прафесара *Валерыя Анісенкі*.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 13 нояб. – С. VI.*

**2 лістапада** ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа прайшоў творчы вечар народнага артыста Беларусі, Лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР *Тадэвуша Антонавіча Кокштыса*.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 6 нояб. – С. IV.*

З **11** па **13 лістапада** на Коласаўскай сцэне адбыліся гастролі Мінскага абласнога драматычнага тэатра (г. Маладзечна). Артысты прапаноўвалі віцебскаму гледачу спектакль па п’есе расійскага драматурга П. Гладзіліна “Афинские вечера”, камедыю “Семейный портрэт с посторонними” драматурга С. Лабазёрава, камедыю А. Слапоўскага “Не такой, как все” і інш.

*http://kolastheatre.by/ru/news/novye-vstrechi-s-minskim-oblastnym*

Акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа *Раман Салаўёў* атрымаў прыз “Лепшая акцёрская работа ў спектаклі тэатра драмы” за роль Сашы ў пастаноўцы паводле аднайменнай аповесці расійскага пісьменніка П. Санаева на трэцім рэспубліканскім



ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”

Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Лістапад-снежань**

*Інфармацыйнае паведамленне*

ВІЦЕБСК

2014

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *Н. А. Пугачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

**Культурнае** жыццё Віцебскай вобласці : лістапад–снежань : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2014. – 32 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2014



*КІНАМАСТАЦТВА*

З **2** па **7 снежня** ў віцебскім кінатэатры “Мир” прайшлі Дні франкафоннага кіно. Пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь прадставіла псіхалагічную драму “Анжель и Тони”, драму “Преследование”, кінастужку “Рина”, камедыю “Вместе – это слишком”.

*Витебские вести. – 2014. – 2 дек. – С. 8.*

*МУЗЫКА*

У сёлятняй праграме **XIX Міжнароднага фестывалю арганнай музыкі “Званы Сафіі”** было 9 канцэртаў, на якіх выступілі вядомыя выканаўцы з Германіі, Польшчы, Швейцарыі, Румыніі, Харватыіі, Расіі і Беларусі. Гэта разнастайныя сольныя арганныя праграмы, а таксама ансамблі (арган з голасам, флейтай, трубой, камерным аркестрам, хорам). Пачаўся фестываль **12 кастрычніка**, а завяршыўся – **23 лістапада**.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 11 нояб. – С. 8.*

**4 лістапада** ў Віцебскай абласной філармоніі выступіў з канцэртам выдатны румынскі арганіст, прафесар, прэзідэнт румынскага грамадства Гімнаграфіі, Саюза кампазітараў і музыказнаўцаў Румыніі *Феліцыян Рошка*.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 1 нояб. – С. 8.*

**22 лістапада** ў Віцебскай абласной філармоніі выступіла этнічная спявачка, кампазітар, піяніст, лаўрэат міжнародных конкурсаў *Ірэна Катвіцкая* з канцэртам-прэзентацыяй альбома Ethno fantasia.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 18 нояб. – С. 7.*

У пачатку **снежня** на базе Аршанскай дзіцячай школы мастацтваў № 1 адбылося свята харавой музыкі – фестываль “Аршанская скарбніца”. Удзел у ім прынялі восем хароў з гарадоў Мінск, Віцебск і Орша. Дыплома III ступені фестывалю ўдастоены хор хлопчыкаў гімназіі № 3 імя А.С. Пушкіна г. Віцебска (кіраўнік *А. Ляхновіч*), дыплома II ступені – узорны дзіцячы хор “Cantare” Аршанскай дзіцячай школы мастацтваў № 1 (кіраўнік *В. Каржыцкая*), дыплом I ступені прысуджаны хору хлопчыкаў

Докшыцкага раёна” ў намінацыі “Вырабы з лазы”; *В.В. Варабчук*, майстар культурна-гістарычнага комплексу “Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна»” ў намінацыі “Фларыстыка”; *М.У. Крукоўскі*, майстар ДУК “Аршанскі Дом рамёстваў” у намінацыі “Корнепластыка”; *Г.В. Тушкіна*, майстар народнага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў Верхнядзвінскага раённага Дома рамёстваў у намінацыі “Вырабы з бяросты”.

*Віцебскі АМЦНТ*

**19 снежня** ў Віцебскім АМЦНТ адкрылася абласная выстаўка батлеек “Зімовая казка”. Дырэктар установы падвяла вынікі і ўручыла дыпломы і навагоднія сувеніры пераможцам. У намінацыі “Традыцыйнае афармленне батлейкі” журы адзначыла прадстаўнікоў Бешанковіцкага і Докшыцкага раёнаў. Узнагароду ў намінацыі “Калекцыя традыцыйных лялек батлейкі” атрымаў калектыў народнага тэатра лялек “Капялюш” з г. Наваполацка, у намінацыі “Сінтэз розных жанраў і мастацтваў” – калектыў Гарадоцкага Дома рамёстваў. Займальны экскурс у гісторыю батлеечнага мастацтва правялі акцёр, вядучы майстар сцэны Беларускага тэатра “Лялька” А. Маханькоў і галоўны мастак АМЦНТ, кандыдат мастацтвазнаўства Л.У. Вакар, распавёўшы гасцям выставы пра асаблівасці пастраення батлеек і адметныя рысы батлеечнага мастацтва Паазер'я. Завяршылася ўрачыстае адкрыццё тэатральным прадстаўленнем творчага калектыву народнага тэатра “У пошуках” Лёзненскага РЦК. Да 20 студзеня наведвальнікі змаглі прыняць удзел у гульнёвых праграмах з казачнымі персанажамі, паглядзець спектаклі пераможцаў і ўдзельнікаў абласнога свята-конкурсу аматарскіх лялечных тэатраў і інш.

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витебские вести. – 2014. – 30 дек. – С. 8.*

Традыцыйнае мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер’я ўнесена ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей нашай краіны, які створаны пры фінансавай і кансультацыйнай падтрымцы UNESCO.



## ЗМЕСТ

**ПРАДМОВА**……………………………………………………………….4

**ХРОНІКА ПАДЗЕЙ**

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне………………………………………………………………..5

## ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 лістапада па 31 снежня 2014 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Міёрскага райвыканкама, Браслаўскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Дубровенскай, Лепельскай, Лёзненскай, Пастаўскай, Полацкай, Сенненскай, Ушацкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.



У Глыбоцкім Доме культуры ўпершыню прайшла выстаўка работ студэнтаў мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава “Красота спасет мир”. Увазе наведвальнікаў былі прадстаўлены некалькі дзясяткаў маляўнічых дыпломных, курсавых практаў, выкананых з саломкі, скуры, каляровай поўсці, дрэва.

*Витебские вести. – 2014. – 4 дек. – С. 22.*

У **снежні** ў Аршанскім этнаграфічным музеі “Млын” працавала выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Скрыжаванне часоў” (мастацкае выпальванне агнём па тканіне, г. Мінск).

**11 снежня** ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ адбылася творчая сустрэча з удзелам магістрантаў педагагічнага і мастацка-графічнага факультэтаў універсітэта імя П.М. Машэрава і замежных студэнтаў акадэміі ветэрынарнай медыцыны з Кітая, Лівана, Туніса, Іарданіі. Спецыялісты ДУ “Віцебскі АМЦНТ” падрыхтавалі для гасцей праграму з гульнямі, дэгустацыяй травяных напояў і нацыянальных страў. У сваю чаргу прадстаўнікі кітайскай народнай культуры паказалі ўдзельнікам вечарыны чайную цырымонію, выканалі народныя песні і танцы, а таксама прадэманстравалі мастацкую творчасць – свае работы прадставілі навучэнцы мастацка-графічнага факультэта. Кожны, хто прысутнічаў на мерапрыемстве, змог паспрабаваць і нацыянальныя стравы Кітая. Студэнты ветакадэміі з Лівана, Туніса, Іарданіі падрыхтавалі відэапрэзентацыю аб сваіх краінах і пачаставалі ўсіх нацыянальнымі стравамі.

*Віцебскі АМЦНТ*

**15 снежня** ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці прайшло закрыццё абласной выставы вырабаў з прыродных матэрыялаў “Прырода і фантазія”, дзе былі падведзены вынікі і вызначаны пераможцы. Дыпломамі былі ўзнагароджаны ўсе ўдзельнікі выстаўкі. Аргкамітэтам былі адзначаны таксама лепшыя ў сваёй справе: *Т.П. Гаварцова*, майстар філіяла № 2 “Докшыцкі раённы Дом рамёстваў” ДУК “Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці

гасцёўні г. Віцебска.

У Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ў **снежні** экспанавалася выстаўка графікі *Валерыя Славука* і жывапісу *Георгія Скрыпнічэнкі*.

**4 снежня** ў Мастацкім музеі г. Віцебска адкрылася выстаўка работ выдатнага беларускага графіка, члена Саюза мастакоў Беларусі Р.П. Клікушына. Экспазіцыя "Улочки Витебска" прадстаўляе сабой графічны партрэт старога горада.

З **4 снежня** ў Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва экспанавалася выстаўка графічных работ *Віктара Шылко* "Реальность странного мира".

**5 снежня** ў Віцебскім мастацкім музеі адкрылася выстаўка акварэлі *Мікалая Образава*, прысвечаная памяці мастака.

У снежні ў Мастацкім музеі г. Віцебска праходзіла выстаўка карціны вядомага віцебскага мастака *А. Малея* "Последние цветы лета".

*ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА*

У **лістападзе** ў Полацкім раённым цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур свой дзесяцігадовы юбілей адзначылі адны з самых вядомых майстроў Полаччыны – народны клуб лапікавага шыцця "Рошва".

*http://www.pvestnik.by/?p=18225*

**14 лістапада** ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ адкрылася абласная выстаўка вырабаў з прыродных матэрыялаў "Прырода і фантазія" (фларыстыка, корнепластыка, вырабы з бяросты і лазы).

*Віцебскі АМЦНТ*

У **лістападзе–снежні** ў культурна-гістарычным комплексе "Залатое кальцо Віцебска «Дзвіна»" дэманстравалася сумесная выстаўка работ майстроў Аршанскага Дома рамёстваў і Цэнтра народнай творчасці і рамёстваў г. п. Копысь "Мы разные, но мы вместе".





## КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

### КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

27 кастрычніка ў г. Маскве стартавала расійска-беларуская акцыя ў гонар 275-годдзя *Іларыёна Апанасавіча Паваліышына*. Мерапрыемствы заклікаMы садзейнічаць развіццю міжрэгіянальных сувязяў і праводзяцца пры садзейнічанні Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, органаў улады і грамадскасці. Пасля расійскай сталіцы эстафету пераняла Разань, затым Мажайск, Кранштат і, нарэшце, Расонскі раён, дзе пахаваны герой расійскага флоту. У вёсцы Янкавічы **5 лістапада** адкрылі памятны знак (падарунак ад ветэранаў ВМФ) і правялі мітынг. Таксама ўсталявалі памятны знак ля гістарычнага месца – дубоў Паваліышына, якія віцэ-адмірал пасадзіў у гонар сваіх сыноў. Заключная прэс-канферэнцыя адбылася ў райцэнтры. Усе ўдзельнікі мерапрыемстваў акцыі атрымалі памятны медаль, які заснаваў рух "Марское братэрства – непарушна!" у памяць пра віцэ-адмірала Паваліышына.

Віцебск з усёй краінай адзначаў **Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі**. У ліку мерапрыемстваў, прымеркаваных да 97-й гадавіны Кастрычніка, – урачысты вечар, які адбыўся напярэдадні святочнай даты ў канцэртнай зале "Віцебск". Пасля афіцыйнай часткі вечара ўвазе прысутных была прапанавана святочная канцэртная праграма, падрыхтаваная лепшымі калектывамі і выканаўцамі ДУ "Цэнтр культуры «Віцебск»".

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 11 нояб. – С. 1.*

**7 лістапада** аграгарадок Акцябрская Віцебскага раёна адзначыў 50-годдзе. У рамках урачыстасцей, што прайшлі ў населеным пункце ў гэты дзень, адбылося адкрыццё памятнака знака воінам-

інтэрнацыяналістам, гістарычны партрэт населенага пункта прадставіла выстаўка ў Доме культуры, адбыліся таксама канцэрт, народныя гулянні, спартыўныя спабрніцтвы і інш.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 13 нояб. – С. 1.*

З **9** па **16 лістапада** ў г. Полацку ў другі раз прайшоў фестываль праваслаўнай культуры "Кладзезь". У духоўна-асветную праграму фестывалю ўвайшло больш за 10 праектаў, якія рэалізоўваліся як у Палацы культуры ААТ "Полацк-Шкловалакно", так і ў іншых установах адукацыі, культуры, медыцыны. Гэта і канцэрт з удзелам паэтэсы і спявачкі Таццяны Дашкевіч, і гутаркі пра здаровы лад жыцця, прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка", гульні, віктарыны, майстар-класы па саломапляценні інш.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 15 нояб. – С. 7.*

Напярэдадні Сусветнага дня дабрыні (13 лістапада) стартавала дабрачынная акцыя "Дари добро!", ініцыятарамі якой стала арганізацыя ГА "Беларускі саюз жанчын", установа дадатковай арганізацыі "Палац творчасці дзяцей і моладзі г. Віцебска" і ГА "Христианское содружество взрослых и молодых". Мэта яе – аказаць дапамогу дзецям-інвалідам абласнога цэнтра. У гэты дзень у Палацы творчасці дзяцей і моладзі адбыўся дабрачынны канцэрт "С добром в сердце" з удзелам творчых калектываў установы.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 15 нояб. – С. 6.*

**13 лістапада** ў канцэртнай зале "Віцебск" прайшоў канцэрт "Посвящение Латвии", у якім прынялі ўдзел вядомыя латышскія ансамблі народнага танца "Сайме" і "Лайсменя". Мерапрыемства адбылося ў рамках традыцыйных Дзён Латвіі ў Віцебску. Да гэтага свята ў Мастацкім музеі адкрылася выстаўка жывапісу вядомага мастака з г. Рэзекне *Освальда Звейсалніекса*, а ў Арт-цэнтры Марка Шагала – экспазіцыя графічных твораў *Марыса Чачкі*, прадстаўленая Арт-цэнтрам імя Марка Роткі ў г. Даўгаўпілсе.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 15 нояб. – С. 5.*



супрацоўнікі Браслаўскага краязнаўчага музея. Браслаўчане прэзентавалі калегам дзённік Сямёна Акімава – рускага афіцэра, вайсковая часць якога дыслацыравалася на лініі фронту, што праходзіла па тэрыторыі Браслаўшчыны.

*Витебские вести. – 2014. – 2 дек. – С. 5.*

Першым кавалерам расійскай узнагароды – "Почетного знака имени Саввы Морозова" стаў у Беларусі палачанін, вядомы калекцыянер і стваральнік ў г. Полацку прыватных музеяў "Эпоха Ленина" і "А.С. Пушкин. Взгляд из прошлого" *Мікалай Глебавіч Панкрат*. Ён стаў першым і першым замежным грамадзянінам, адзначаным такой памятнай узнагародай у г. Арэхава-Зуева Маскоўскай вобласці, заснавальнікам якога была вядомая дынастыя прамыслоўцаў і мецэнатаў Марозавых.

*http://www.pvestnik.by/?p=18084*

Тыдзень Міхася Лынькова прайшоў у Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі з **2** па **6 снежня** і быў прысвечаны 115-й гадавіне з дня нараджэння народнага пісьменніка БССР.

*Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2014. – 6 снеж. – С. 1.*

## МАСТАЦТВА

### *ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА*

**14 лістапада** ў Віцебскім мастацкім музеі пачала работу выстаўка работ *Людмілы Русавай* "Бытие". Экспазіцыя прысвечана 60-годдзю з дня нараджэння мастачкі, якая пакінула гэты свет у 2010 годзе. Творчасць мастачкі стаіць ля вытокаў зараджэння беларускага перфарматыўнага мастацтва, і яе творы адносяць да беларускага авангарду 1990-х – 2000-х гадоў.

На выстаўцы "Арт-сезон-2014", адкрыццё якой адбылося **24 снежня** ў Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва, у найбольшай ступені былі прадстаўлены работы сімвалічнага і абстрактнага кірункаў.

Выстаўка графічных і жывапісных работ латышскай мастачкі *Элгі Грынвальдэ* "Сакральное прикосновение" адкрылася ў **снежні** ў Музычнай

курэння для вучняў старэйшых класаў адбылася віктарына “Никогда не буду курить!”.

***Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

У **лістападзе** ў межах амарскага аб’яднання паэтаў “Млын” пры *Новалукомльскай гарадской бібліятэцы* прайшла прэзентацыя кнігі вершаў “Наша жизнь” *Ганны Кляшчонак*.

***Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**9 лістапада** Літаратурная сустрэча “К нам Лермонтов сходит, презрев времена”, прысвечаная 200-годдзю з дня нараджэння паэта (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**25 лістапада** Творчая сустрэча з паэтэсай, старшынёй Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі *Тамарай Іванаўнай Красновай-Гусачэнка* “Вся наша жизнь, как на одном дыхании” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**28 снежня** Літаратурнае падарожжа для школьнікаў “Час казачных прыгод” (*Светласельская сельская бібліятэка*).

*МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ*

Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва ў **лістападзе** падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве з культурным цэнтрам “Дусятская художественная галерея” Зарасайскага раёна Літвы. Першым вынікам партнёрства з Літвой стане ўзаемаабмен выстаўкамі віцебскіх і літоўскіх мастакоў.

У музеі-сядзібе І.Я. Рэпіна “Здраўнёва” ў **лістападзе** прайшла выстаўка работ віцебскай мастачкі *Таццяны Грабовік*. У экспазіцыі былі прадстаўлены дваццаць жывапісных работ, выкананых у стылі імпрэсіянізма.

У **лістападзе** ў Наўенскім краязнаўчым музеі Латвіі прайшла міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная Першай сусветнай вайне. Разам з навукоўцамі Літвы, Латвіі і Расіі ўдзел у ёй прынялі і



**18 лістапада** г. Віцебск наведаў пасол Японіі ў Рэспубліцы Беларусь *Сігэхіро Меморы*, які прыняў удзел у дэманстрацыі чайнай цырымоніі, што прайшла ў Доме кіно.

*КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ*

Калектывы Цэнтра культуры “Віцебск” – студыя эстраднай песні “Форум”, тэатр песні і музыкі “Прасторы” і падрыхтоўчая вакальна-харэаграфічная студыя “До-ми-соль” сталі ўдзельнікамі **VI Міжнароднага фестывалю “Балтийский вояж-2014”**, які прайшоў з **2** па **6 лістапада** на круізным карабелі “Изабелла”, па маршруце Рыга–Стакгольм–Рыга. Віцебскія калектывы былі прадстаўлены ў чатырох вакальных жанрах (эстрадны, народны, джаз і поп-рок). Пераможцамі сталі:

– студыя “До-ми-соль”: *Марыя Балоцкая* (спецыяльны прыз у народным жанры) і *Анастасія Собалева* (спецыяльны прыз у эстрадным жанры);

– студыя эстраднай песні “Форум” *Віка Апанасёнак* (I месца ў народным жанры), *Уладзіслава Бурунова* (III месца ў эстрадным жанры), *Дзіяна Зайцава* (спецыяльны прыз у эстрадным жанры). Студыя выступіла не толькі ў сольнай намінацыі, але і ў калектыўнай: народная песня “Курачка” прынесла калектыву II месца;

– тэатр песні і музыкі “Прасторы”: *Сяргей Кухарэнка* (I месца ў жанры “поп-рок” і ў эстрадным жанры) *Яна Кушчына* (II месца ў жанры “джаз”).

*http://www.gck.by/2014/11/7622*

**12 снежня** ў г. Туапсе (Расійская Федэрацыя) былі падведзены вынікі міжнароднага конкурсу дзіцячай выяўленчай творчасці “Я рисую, как Киселев”. Сярод пераможцаў і тры выхаванкі студыі выяўленчага мастацтва Віцебскага абласнога палаца дзяцей і моладзі. Васьмігадовая *Ганна Пецкалёва* заняла першае месца ў намінацыі “Пейзаж – настроение”. Другое падзялілі *Аляксандра Сцінкавая і Анастасія Калужэнка*.

*Витебские вести. – 2014. – 3 янв. – С. 22.*

Да існуючых дамоўленасцей паміж калектывамі Браслаўшчыны і замежнымі партнёрамі з прыгранічных тэрыторый Літвы і Латвіі дабавілася новае пагадненне, якое заключылі Відзаўская музычная школа і Шпогская музычная і мастацкая школа Даўгаўпілскага краю Латвіі. Акрамя абмену вопытам, візітаў дэлегацый, правядзення сумесных мерапрыемстваў новы дагавор прадугледжвае магчымасць стварэння міжнародных праектаў і выхаду на еўрапейскія фонды таленавітай моладзі.

*Витебские вести. – 2014. – 13 дек. – С. 2.*

## КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

*АГРАЭКАТУРЫЗМ*

Віцебская вобласць атрымала грант па праграме падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі на развіццё аграэкатурызму. Праект будзе рэалізоўвацца да сакавіка 2016 года і ў цэлым скіраваны на абучэнне гаспадароў аграэкасядзіб вобласці, а таксама матывацыю членаў рэгіянальных грамадскіх саветаў па развіцці аграэкатурызму. За кошт сродкаў нямецкага фонду будуць прафінансаваны два рэгіянальныя фестывалі – “Родник здоровья” ў Полацкім раёне і “Летнік рамёстваў” – у Міёрскім.

*Твой город. – 2014. – 18 дек. – С. 2.*

*КЛУБНАЯ СПРАВА*

Абласны этап агляду-конкурсу “Елка-фэст-2014” прайшоў у абласным цэнтры, па выніках якога *Аляксандр Ціханенка* і *Вікторыя Шумко* з абласнога Палаца дзяцей і моладзі атрымалі званне лепшых Дзеда Мароза і Снягуркі, і прадставяць наш рэгіён на рэспубліканскім “Елка-фэсце” 12 снежня ў г. Мінску.

*Витебские вести. – 2014. – 22 нояб. – С. 16.*



*сельскай бібліятэкі* “Роля бібліятэкі як інфармацыйна-культурнага цэнтра ў адраджэнні нацыянальнай культуры”.

**23 лістапада** Сустрэча з паэтэсай, ураджэнкай в. Стары Двор Варапаеўскага пасялковага Савета *Вольгай Лісіцкай* “На паэтычным ганачку” (*Варапаеўская гарпасялковая бібліятэка*).

**12 снежня** Творчая сустрэча з пісьменнікамі *Тамарай Лісіцкай* і *Ігарам Паляковым*, прэзентацыя кнігі Т. Лісіцкай “Багіня, або Плач хатняй гаспадыні” (*цэнтральная раённая біблітэка*).

**16 снежня** Прэзентацыя кнігі пастаўскай паэтэсы *Марыны Кавалёнак* “Ступені” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

### *Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк*

**5 лістапада** Літаратурная сустрэча “Вернасць роднаму слову…” з галоўным рэдактарам Дырэкцыі замежнага вяшчання Беларускага радыё, ганаровым грамадзянінам г. Полацка Н. Гальпяровічам, намеснікам дырэктара выдавецтва Дома “Звязда”, галоўным рэдактарам часопіса “Полымя” А. Бадаком, членам Праўлення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, галоўным рэдактарам часопіса “Гаспадыня” З. Прыгодзічам (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).

**16 лістапада** Літаратурна-музычная кампазіцыя “Хвала рукам, што пахнуць хлебам”, прысвечаная Дню работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці (*Шпакоўшчынская сельская бібліятэка-клуб*).

### *Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк*

У **лістападзе** ў *Ходцаўскай сельскай бібліятэцы* для сельскіх бібліятэкараў раёна прайшоў выязны семінар “Беларуская мова і літаратура – выток нацыянальнай культуры”.

### *Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк*

У *Вяркудскай сельскай бібліятэцы* да Міжнароднага дня адмовы

Да 115-годдзя з дня нараджэння пісьменніка М. Лынькова ў бібліятэках адбыліся: бібліяграфічны круіз “Творчы шлях М. Лынькова” (*Старалядненская сельская бібліятэка*), гульня-віктарына “Сустрэча з Міхасём Лыньковым” (*Слабадская сельская бібліятэка*) і інш.

**11 лістапада** Літаратурная кампазіцыя “Тут карані, адсюль выток” з удзелам паэта літаратурна-музычнага клуба “Выток” *А. Сергіёнкам* (*дзіцячая бібліятэка*).

**17 снежня** Паэтычныя адвячоркі “Як прызнанне ў любові: пісьменнікі і паэты пра Лепель” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**21 снежня** Выстаўка-агляд да 80-годдзя з дня нараджэння пісьменніка І. Чыгрынава “Ішоў праз вайну чалавек” (*Слабодская сельская бібліятэка*).

***Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк***

**12 лістапада** Літаратурная гадзіна “Добры хлопец Дзік” па творчасці М. Лужаніна (*дзіцячая бібліятэка*).

**27 лістапада** Літаратурная кампазіцыя “А на зямлі яго не згасне свет”, прысвечаная 115-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі М. Лынькова (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк***

**20 лістапада** Круглы стол “Тваё жыццё – твой выбар”, прысвечаны Міжнароднаму дню адмовы ад курэння і прафілактыцы анкалагічных захварванняў (*Міёрская цэнтральная бібліятэка сумесна з УАЗ “Міёрская ЦРБ” і ГА “БРСМ”*) з удзелам працуючай моладзі горада.

**27 лістапада** Семінар бібліятэчных работнікаў раёна “Сучасныя тэхналогіі падтрымкі і развіцця чытання” на базе *Міёрскай цэнтральнай раённай бібліятэцы*.

***Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**13 лістапада** Семінар бібліятэчных работнікаў на базе *Валкоўскай*



**6 лістапада** заслужанаму аматарскаму цырку “Юнацтва” (г. Наваполацк) споўнілася 45 гадоў.

**13 лістапада** ў Цэнтры культуры “Віцебск” адбыліся **рэгіянальныя адборачныя туры XXIV Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск-2015”** і **XIII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу “Віцебск-2015”**. Па выніках галасавання Віцебскую вобласць на рэспубліканскім адборачным туры прадставяць дарослыя: *А. Філіпава* (г. Міёры), *М. Камянкоў* (г. Полацк), *В. Горына*, *А. Лейкіна* і *М. Пісарэнка* (г. Віцебск); дзеці: *Д. Гуйдо* (г. Наваполацк), *Д. Дымман* (г. Лепель), *Д. Матвеева*, *У. Старчанка* і *Н. Фургал* (г. Віцебск).

*Віцебскі АМЦНТ*

*http://www.gck.by/2014/11/7589*

**15 лістапада** прайшоў ўрачысты юбілейны вечар “С днем рождения, родной наш дворец!”, прысвечаны 50-гадоваму юбілею ДК г. Барань. У канцэрце прынялі ўдзел узорны тэатр “Вясёлка”, калектыў сучаснага ўсходняга танца “DaliMaissa”, калектыў эстраднага танца “Кристалл”, узорны калектыў “Адамант”, народны ансамбль народнай музыкі і песні “Крынічанька” і інш.

*Аршанская газета. – 2014. – 15 лістап. – С. 5.*

**Абласны конкурс на лепшую арганізацыю вечароў адпачынку і дыскатэк** праходзіў у вобласці па рэгіёнах **21 лістапада**, **22 лістапада** і **6 снежня**. Пераможцы вызначаліся па намінацыях “Лепшая шоу-праграма”, “Лепшы вядучы па арганізацыі вольнага адпачынку дарослага насельніцтва”, “Лепшая традыцыйная народная праграма «Для тых, каму за…»”, “Лепшая відэапрэзентацыя «speed-dating» – знаёмства з хуткасцю святла”, “Інавацыі па арганізацыі вольнага часу, вечароў адпачынку дарослага насельніцтва”. Па выніках агляду-конкурсу звання лаўрэата І ступені ўдастоены праграмы Міёрскага РДК, Дома культуры аграгарадка Крынкі Лёзненскага раёна, Зялёнкаўскага СДК Полацкага раёна і Докшыцкага ГЦК. У межах агляду быў праведзены і **абласны**

**конкурс гульнёвых праграм для дарослых “Гуляць, дык гуляць!”**, па выніках якога з 11 прадстаўленых лепшымі прызнаны гульнёвыя праграмы Перабродскага СДК Міёрскага раёна, Лужкоўскага СДК Шаркаўшчынскага раёна, Лёзненскага раённага цэнтра культуры, Обальскага ГДК Шумілінскага раёна, Цэнтра культуры г. Наваполацка, Полацкага і Верхнядзвінскага РДК, Расонскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці.

*Віцебскі АМЦНТ*

У рамках падрыхтоўкі да святкавання 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў г. Оршы з **24** па **27 лістапада** адбыўся першы раённы шматжанравы **фестываль самадзейнай творчасці “Серебряный век”**. Усяго ў фестывалі, які праходзіў у два этапы, прынялі ўдзел больш за 100 канкурсантаў ва ўзросце ад 50 гадоў і старэй. Гасцямі мерапрыемства сталі народны вакальны ансамбль “Беларусачка” ГДК і народны ансамбль народнай музыкі “Крынічанька” ДК г. Барані, а таксама лаўрэат першай ступені дзіцяча-юнацкага конкурсу эстрадна-цыркавога мастацтва “Ветразі надзеі-2014” Самір Елчыў.

*Аршанская газета. – 2014. – 13 снеж. – С. 4.*

**27 лістапада** ў выставачнай зале “Духаўскі круглік” прайшла сустрэча з аўтарам манаграфіі “История витебской окружной милиции”, гісторыкам *Інай Абрамавай*.

*http://www.gck.by/2014/11/7609*

**3 снежня** ў Палацы культуры ААТ “Полацк-Шкловалакно” прайшоў гала-канцэрт мастацкай самадзейнасці, які завяршыў мерапрыемствы **ІІІ Дабрачыннага творчага праекта “С верой, надеждой, любовью”**, што быў прымеркаваны да Дня інвалідаў Рэспублікі Беларусь. У канцэрце прынялі актыўны ўдзел у тэатралізаваных пастаноўках, вакальных і танцавальных нумарах больш за 20 чалавек з абмежаванымі магчымасцямі ва ўзросце ад 7 да 70 гадоў. Добры настрой удзельнікам свята падарыў спявак *Аляксей Хлястоў*.

*Полацкі веснік. – 2014. – 27 снеж. – С. 11.*



***Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк***

У час зімовых канікул чытачы малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту *Дзяцельскай сельскай бібліятэкі* прынялі ўдзел у тэатралізаваным прадстаўленні “Новогодние приключения кота Матроскина и его друзей”, а чытачы *сельскай бібліятэкі аграгарадка Буда* ўбачылі лялечны спектакль “Зімовая казка”.

***Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**25 лістапада** Сустрэча з паэтамі Латвіі “Калі радкі дыктуе пачуццё” (*цэнтральная раённая бібліятэка*). У мерапрыемстве прынялі ўдзел член Саюза пісьменнікаў Беларусі *Станіслаў Валодзька* і ўраджэнка Браслаўскага раёна *Ірына Страздоніка–Плячко*, члены літаратурнага раённага аматарскага аб’яднання “Ветразь надзеі” і клуба “Сустрэча”.

**21–30 лістапада** Дэкада, прысвечаная 515-годдзю вёскі Іказнь “Край мой родны – зямля Ікazненская”, у рамках якой адбыліся наступныя мерапрыемствы: гістарычная гадзіна “Мая родная Іказнь! Край гасцінны, прыгожы!”, прэзентацыя буклета “Вёска Іказнь і яе жыхары ў люстэрку часу”, сустрэча з мясцовымі майстрамі “Стваральнікі прыгажосці” (*Іказненская сельская бібліятэка*).

**16 снежня** Літаратурнае падарожжа па творчасці М. Лермантава “К той, что прекрасна, как мечтание” з удзелам члена аматарскага клуба “Сустрэча” В.І. Туманавай (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк***

У рамках Рэспубліканскай антытытунёвай акцыі інфармацыйна-адукацыйнай акцыі з **17** па **20 лістапада** ў бібліятэках прайшлі наступныя мерапрыемствы: дыспут “Жизнь в табачном дыму” (Баброўская сельская бібліятэка-музей імя Я. Мароза), гадзіна здароўя “Курить совсем не модно” (*Забароўская сельская бібліятэка*), медыяпрэзентацыя “Унесенные табаком” (*Каменская сельская бібліятэка-музей імя Т. Кляшторнага*) і інш.

у мерапрыемстве прынялі валеолаг, педыятр і валанцёр цэнтра, прайшла акцыя “Конфета вместо сигареты”.

**25 лістапада** ў рамках праграмы “Книжный сад” стартаваў праект “Волшебный рюкзачок”, накіраваны на індывідуальную работу з дашкольнікамі і іх бацькамі (*дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака*).

**26 лістапада** Конкурс чытальнікаў твораў беларускіх аўтараў, прысвечаных 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў “Іх подзвіг жыве непаўторны і вечны” (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя У. Маякоўскага*).

***Віцебская раённая сетка публічных бібліятэка***

**11 лістапада** Круглы стол для падлеткаў і моладзі “Алкоголизм – пунь в никуда…” з удзелам дырэктара Воронаўскай СШ *Г.А. Філіпенка*, участковага інспектара *Д.А. Генюк*, фельчара *А.Б. Умецкай*.

**12 лістапада** Сустрэча з мясцовай паэтэсай *Л.К. Максімавай* “Наперакор лёсу” (*Суражская гарпасялковая бібліятэка*).

***Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**12 лістапада** ўдзельнікі праекта “Прафесійныя сустрэчы-2014” наведалі *Вархоўскую сельскую бібліятэку.*

**16 лістапада** Паэтычная старонка “Я славы не ждала”, прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння Ганны Ахматавай (*Езярышчанская сельская бібліятэка*).

***Докшыцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**5 лістапада** Забаўляльная праграма “Вас ожидают приключения на острове «Чтения»” (*дзіцячая раённая бібліятэка*).

**28 лістапада** Літаратурны турнір “Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго” (*Бягомльская гарпасялковая бібліятэка імя П. Панчанкі*).



Уся гама музычнай і мастацкай творчасці была прадэманстравана людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі на **раённым конкурсе творчасці інвалідаў “Святло душы тваёй” 3 снежня** ў аграгарадку Ноўка Віцебскага раёна. Конкурс даў магчымасць інвалідам рэалізаваць свой творчы патэнцыял праз мастацтва, прыгажосць якога яны стараліся перадаць публіцы. Народны і эстрадны вакал, харавыя спевы, паэтычная творчасць, інструментальнае выкананне, тэатральнае, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва... Менавіта ў такіх намінацыях журы ацэньвала канкурсантаў з Бабініч, Ноўкі, Суража, Мазалава, Сялюцкага і Варонаўскага дамоў-інтэрнатаў.

*http://www.pridvinje.by/2014/12/na-rajonnom-konkurse-tvorchestva-invalidov-byla-prodemonstrirovana-*

**6 снежня** ў в. Пераброддзе Міёрскага раёна ўшаноўвалі з нагоды 90-гадовага юбілею кіраўніка (1945–1989) Перабродскага народнага хору *Аляксандра Сяргеевіча Сяліцкага*. Юбіляру была ўручана Ганаровая грамата райвыканкама, а самадзейныя артысты з РДК песнямі нагадалі ветэрану яго творчую маладосць.

*Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Міёрскага райвыканкама*

**10 снежня** ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці быў праведзены абласны семінар для кіраўнікоў харавых калектываў вобласці з мэтай павышэння мастацкага ўзроўню канцэртных выступленняў вакальна-харавых калектываў. Галоўнай на семінары з'яўлялася тэма “Правядзенне рэгіянальнага свята-конкурсу «Браслаўская харавая асамблея» ў межах Міжнароднага свята традыцыйнай культуры “Браслаўскія зарніцы”. Галоўны хармайстар АМЦНТ *А.П. Слінькова* азнаёміла прысутных з аглядам мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў Віцебскай вобласці па вакальна-харавым жанры. Намеснік дырэктара ДУ “Віцебскі АМЦНТ” *З.А. Гукава* правяла практычны занятак “Вядзенне часопісаў гуртковай працы”. Для ўдзельнікаў семінара адбыўся канцэрт з удзелам народнага ансамбля народнай песні “Раніца” і народнага

вакальнага ансамбля “Пчоланька” Віцебскага раённага Дома культуры. За час правядзення семінара ўдзельнікі абмеркавалі асноўныя напрамкі развіцця вакальнага жанру ў вобласці, рэпертуар зводнага хору і інш. Да семінара быў выдадзены зборнік партытур для народнага і акадэмічнага хору “Браслаўская харавая асамблея”.

*Віцебскі АМЦНТ*

*ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ*

У **лістападзе** ў Віцебскай абласной філармоніі прайшоў **II Міжнародны фестываль-конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці “На легендарной сцене”**. Прадстаўнікі 23 гарадоў Расіі і Беларусі спаборнічалі ў інструментальнай, вакальнай, тэатральнай творчасці і харэаграфіі. Віцебск прадстаўляла навучэнка гімназіі № 3 імя А.С. Пушкіна *Дар’я Матвеева* (педагог С. Астапенка) з творчым нумарам “Облака” ва ўзроставай групе ад 7 да 10 гадоў.

У г. Сянно **4 лістапада** адбылося **Ш абласное свята-конкурс аматарскіх тэатраў “Лялечны свет”**. 13 лялечных тэатраў вобласці прадставілі свае спектаклі. У другі раз на абласным свяце прайшла дабрачынная акцыя “«Лялечны свет» – дзецям”, у рамках якой удзельнікі конкурсу парадавалі падарункамі дзяцей са шматдзетных і малазабяспечаных сямей, выхаванцаў дзіцячага дома, цэнтра карэкцыйнага развіцця. У *намінацыі “Лялечны спектакль”* І месца падзялілі народны тэатр “Вытворяшки” Пастаўскага РДК (кіраўнік *А.Слядзеўская*) і ўзорны лялечны тэатральны калектыў “Дзіковінка” Глыбоцкага цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці (кіраўнік *А. Заяц*), ІІ месца ва ўзорнага лялечнага тэатра “Батлейка” Шумілінскага Дома рамёстваў (кіраўнік *К. Жогаль*). У намінацыі *“Батлейка”* прызавыя месцы занялі дэбютанты абласнога свята-конкурсу – тэатр “Батлейка” Браслаўскага раённага аб’яднанняў музеяў (кіраўнік *І. Вашкель*), “Докшыцкая батлейка” філіяла № 1 “Докшыцкага гарадскога цэнтра культуры” Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці (*кіраўнік*



**25 лістапада** ў бібліятэцы адбылася прэзентацыя факсімільнага выдання Тураўскага Евангелля – помніка старажытнаславянскай пісьменнасці XI стагоддзя.

**9 снежня** паміж ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна” і ДУА “Сярэдняя школа № 45 г. Віцебска” быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве, мэта якога – папулярызацыя вывучэння нямецкай мовы як замежнай і павышэнне ўзроўню культурнага развіцця школьнікаў.

**22 снежня** ў Нямецкай чытальнай зале адбылося падвядзенне вынікаў гарадскога конкурсу Адвэнт-календароў “Warten auf das Fest ist ein Fest” – “Чаканне свята і ёсць свята”.

***Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк***

**19 лістапада** Творчая сустрэча “Я – цэлы свет, я – цэлая планета…” з актрысай Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, вядучым майстрам сцэны *Р. Грыбовіч* (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

**26 лістапада** Літаратурная вечарына “Уладзіміру Караткевічу – 84!”, у час якой адбылася прэзентацыя кнігі *Дзяніса Марціновіча* “Жанчыны ў жыцці Уладзіміра Караткевіча”.

**16 снежня** Прэзентацыя кнігі віцебскага паэта *А.В. Семашкі* “Чистая сила любви” (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

**23 снежня** Урачыстая вечарына “Бібліятэка на ўсе часы” з нагоды 95-годдзя ЦГБ імя М. Горкага.

***Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк***

**14 лістапада** Сустрэча-гутарка “Береги себя смолоду” з айцом Георгіем (*дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна*).

**19 лістапада** Гадзіна добрых парад “Жизнь без сигарет – здоровье без бед” ў рамках Рэспубліканскай антытытунёвай інфарамацыйна-адукацыйнай акцыі і да Міжнароднага дня адмовы ад курэння (*бібліятэка імя У. Караткевіча сумесна з Цэнтрам здароўя моладзі “Дыялог”*). Удзел

– у намінацыі “**За пошукавую і даследчую працу**”:

Дубровенская цэнтральная раённая бібліятэка, трэцяя прэмія (дырэктар *Наталля Мікалаеўна Фарэйтарава*);

Дабейская сельская бібліятэка Шумілінскай ЦБС, другая прэмія (загадчык *Ала Мікалаеўна Бубен*);

– у намінацыі “**За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем**”:

Лепельская цэнтральная раённая бібліятэка, заахвочвальная прэмія (дырэктар *Ірына Уладзіміраўна Тарасава*);

Якубаўшчынская сельская бібліятэка Лёзненскай ЦБС, заахвочвальная прэмія (загадчык *Ганна Мікалаеўна Кірылкіна*).

***Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна***

**4 лістапада** ў Віцебскай абласной бібліятэцы адбылося ўзнагароджанне пераможцаў абласнога літаратурнага конкурсу сярод дзяцей і моладзі, прысвечанага 70-годдзю вызвалення Віцебскай вобласці і Вялікай Перамогі. У конкурсе прынялі ўдзел 350 навучэнцаў гарадскіх і сельскіх навучальных устаноў Віцебскай вобласці, на суд журы было прадстаўлена больш за 1070 работ. Было вызначана 45 пераможцаў у розных намінацыях.

**11 лістапада** ў бібліятэцы прайшла прэзентацыя кнігі “Юшка Вялеса” журналісткі, краязнаўцы, пісьменніцы *Святланы Уладзіміраўны Гук* (*Дзядзінкінай*).

**12 лістапада** ў аддзеле перыядычнай літаратуры адбылася літаратурна-музычная вечарына «Поэзии и музыки связующая нить», у якой прынялі ўдзел члены літаратурнага аб'яднання “Вдохновение” Віцебскай гарадской арганізацыі “Беларускае таварыства інвалідаў па зроку”.

**20 лістапада** ў чытальнай зале Віцебскай абласной бібліятэкі прайшла прэзентацыя кнігі А.М. Падліпскага і У.А. Рызо “Лагерь смерти «5-й полк»”.



*Т. Канцавая*), калектыў “Кукляняткі” Кіраўскага СДК Віцебскага раёна (кіраўнік *С. Драчэніна*). Гран-пры свята быў уручаны народнаму тэатру лялек “Капялюш” Наваполацкага цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры (кіраўнік *А. Рэцікаў*). Пераможцамі **абласнога конкурсу дзіцячых гульнёвых праграм** “Гульнёвыя вясёлка” сталі народны калектыў тэатра гульні “Зазеркалье” Цэнтра культуры г. Наваполацка і творчы калектыў Браслаўскага РДК (дыпломы І ступені), узорны тэатр гульні “Игрик” Верхнядзвінскага РДК і творчы калектыў работнікаў Райцаўскага СДК Талачынскага раёна (дыпломы ІІІ ступені).

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 15 нояб. – С. 10.*

**14–15 лістапада** ў г. Наваполацку праходзіў **Рэспубліканскі конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні “Халі-Хало”**. Гран-пры конкурсу заваявала выхаванка магілёўскай студыі “Радуга” *Ганна Трубяцкая*. Лаўрэатам дыплома І ступені ў старэйшай узроставай катэгорыі прызнана навапалачанка *Ксенія Вашчанка*, выхаванка вакальнай студыі “8-я нота” гарадскога цэнтра культуры. Першае месца ў сярэдняй і малодшай узроставай групе заваявалі магілеўчанкі *Ірына Круглік* і *Алена Цітова*. Дыпломамі лаўрэатаў І ступені ўзнагароджаны – у старэйшай узроставай групе гамяльчанін *Ілля Карпенка*, у сярэдняй – мінчанка *Ангеліна Трыпута*, а ў малодшай – навапалачанка, выхаванка студыі “Изюминка” *Дзіяна Гуйдо*.

*Новополоцк сегодня. – 2014. – 14 нояб. – С. 1, 13.*

У г. Гарадку **15 лістапада** адбыўся **VI абласны агляд-конкурс харэаграфічных калектываў “Прыдзвінскія карункі”**, у якім прынялі ўдзел амаль 500 танцораў з 20 вядучых аматарскіх харэаграфічных калектываў гарадоў і раёнаў Віцебшчыны. Конкурс прайшоў па намінацыях: “Лепшае выкананне аўтарскіх танцаў І.А. Серыкава” (званне лаўрэата І ступені атрымалі творчая група УА “Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў” (мастацкі кіраўнік *І. Гайдуковіч*) і ўзорны харэаграфічны калектыў “Крынічка” ДУ “ДК г. п. Руба” (мастацкі кіраўнік

*С. Нікалаенка*)); “Лепшая новая балетмайстарская пастаноўка беларускай накіраванасці” (I месца падзялілі паміж сабой узорны калектыў “Лялькі” Верхнядзвінскага РДК (мастацкі кіраўнік *Л. Гуйда*) і народны ансамбль танца “На ростанях” УА “Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў” (мастацкі кіраўнік *С. Ракоўскі*)); “Лепшы эстрадны танец з адлюстраваннем нацыянальнай тэматыкі, нацыянальных беларускіх матываў” (I месца – у народнай студыі сучаснага УА “Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў” (мастацкі кіраўнік *І. Бухавецкая*)). Гран-пры атрымаў народны ансамбль песні і танца “Яблынька” Дома культуры г. Гарадка (мастацкі кіраўнік *Д. Сцяпанава*).

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 22 нояб. – С. 5.*

З **19** па **23 лістапада** ў г. Віцебску праходзіў **XXVII Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі**, вынікі якога былі падведзены 23 лістапада на ўрачыстым закрыцці конкурсу. Гран-пры IFMC заваяваў японскі дуэт *Аяка Хабата* і *Котара Іто* з пастаноўкай “Nil”, уладальнікам першай прэміі стаў тэатр танца з г. Валагды “O’She” (Расійская Федэрацыя). Беларусы атрымалі дзве другія прэміі: праект *Сяргея Паяркова* і *Ігара Нічыпарука* з г. Мінска і тэатр-студыя Дзіяны Юрчанкі з г. Віцебска. Другая прэмія прысуджана і “Totem dance group” з г. Кіева (Украіна). Трэціх прэмій журы вызначыла таксама тры, іх удастоены Тэатр-студыя сучаснай харэаграфіі з г. Масквы (Расійская Федэрацыя) за конкурсныя работы “Три сестры” і “Домой”, а таксама праект *Уладзіміра Міцева* з г. Кіева (Украіна). Прэмія імя Яўгена Панфілава прысуджаная найлепшаму харэографу *Вользе Гарабчук* з работай тэатра танца “нОга” з г. Омска (Расійская Федэрацыя).

*http://by.belapan.com/archive/2014/11/24/by_media_horeografia/*

**XXVI Міжнародны музычны фестываль імя І.І. Салярцінскага** прайшоў з **2** па **14 снежня**. Асаблівасцю фестывальнай праграмы гэтага года з’яўляецца акцэнт на адкрыццё новых для горада імёнаў ужо тытулаваных артыстаў і калектываў. Сюрпрызам фэстывалю стала ўключэнне ў праграму джаза. Традыцыйна ў час форуму прайшлі навуковыя чытанні, у якіх прынялі ўдзел даследчыкі з Беларусі, Расіі і Польшчы. Адбыліся прэзентацыі дзвюх кніг, прысвечаных творчасці Аляксандра Сакурава і Барыса Цішчанкі, а таксама беларускага выдання “Кампазітары Беларусі” Таццяны Мдзівані і Веры Каштальян.



*Твой город (Витебск). – 2014. – 11 дек. – С. 4.*

**5 снежня** ў г. Віцебску на базе Культурна-спартыўнага цэнтра “Палац культуры і тэхнікі чыгуначнікаў” адбыўся **абласны агляд-конкурс творчасці інвалідаў “Глядзі на мяне як на роўню”**. Арганізатарамі дадзенага мерапрыемства выступілі Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама разам з камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама, Віцебскім аддзяленнем “Беларускі фонд міру”, Віцебскай абласной арганізацыяй Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа і інш. Асноўная мэта агляду-конкурсу – стымуляванне развіцця мастацкай творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі як сродка іх рэабілітацыі і сацыяльнай адаптацыі. У намінацыі “Вакальна-харавая творчасць” першае месца падзялілі народны хор народнай песні УП “Элект” ГА “БелТІЗ” (г. Віцебск), *Яўген Сугак* (ТЦСАН Аршанскага раёна) і *Арцём Сяменчанка* (Лёзненскі раён). У намінацыі “Харэаграфічнае мастацтва” дыпломамі пераможцы былі адзначаны творчы калектыў “Ветразь надзеі” (ТЦСАН Чашніцкага раёна), *Наталля Мядзведская* і *Уладзімір Лазарчык* (Сенненскі раён). У намінацыі “Тэатральнае мастацтва” званне лаўрэата I ступені ўдастоена *Вольга Кананові*ч (*Дубровенскі раён*).

*Віцебскі АМЦНТ*

## *БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА*

Па выніках **XXII Рэспубліканскага конкурсу “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”** за 2013 год пераможцамі прызнаны наступныя бібліятэкі: